Социальные опасения могут привести к дистанцированию от государственной власти. В заключительном слове Президента А.Г. Лукашенко на IV Всебелорусском народном собрании была четко сформулирована позиция главы государства: "Теперь мы должны прямо и честно сказать людям, что дальнейший рост качества их жизни будет зависеть от личного труда и предприимчивости". Провозглашая 2011 год "Годом предприимчивости", руководство страны, шестнадцать предыдущих лет неуклонно формировавшее у белорусов чувство защищённости государством, предлагает отказаться от неэффективных в современной ситуации ментальных конструктов. Предприимчивость должна стать неотъемлемой частью белорусского менталитета, что будет способствовать развитию общественно-политических и экономических отношений в стране, устранив препятствия на пути дальнейшего развития республики как независимого государства.

**Список цитированных источников**

1. Министерство статистики Беларуси [Электронный ресурс]. – Минск, 2011. – Режим доступа: http://www.president.gov/Minstat

## АСЭНСАВАННЕ ЗРУХАЎ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ Ў МАСТАЦКІМ МЫСЛЕННІ

Борсук Н.Н.
*Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, г. Брэст, Беларусь*

У мастацкай літаратуры як у люстэрку адбіваюцца людскія настроі, стан народнага самапачування, мары, надзеі нашых сучаснікаў. На сённяшні дзень у нас няма нейкага іншага віду мастацтва, роўнага літаратуры па магчымасцях духоўнага выхавання асобы. Мяняюцца часы. Безумоўна, усе змены, што адбываюцца ў грамадстве, адбіваюцца і ў літаратуры, асабліва гэта датычыцца ўспрымання пэўных гістарычных падзей, імён і г.д. Па гэтай прычыне асэнсаванне зрухаў мастацкага мыслення як выявы беларускай гісторыі – адна з надзённых праблем літаратуразнаўства.

Феномен беларускай літаратуры бачыцца ў тым, што яна за кароткі тэрмін стала ўпоравень з перадавымі літаратурамі свету (напрыклад, літаратура лужыцкіх славян склалася толькі пасля перамогі над фашысцкай Германіяй, у 40-50-я гады XX ст.). М. Багдановіч у артыкуле «Забыты шлях» пісаў: «За восем-дзевяць год свайго праўдзівага існавання наша паэзія прайшла ўсе шляхі, а пачасці і сцежкі, каторыя паэзія еўрапейская пратаптывала болей ста год... Сентыменталізм, рэалізм, натуралізм, урэсьце, мадэрнізм – усё гэтае, іншы раз нават у іх рожных кірунках, адбіла наша паэзія, праўда, найчасцей бегла, няпоўна, але ўсё ж ткі адбіла» [2, с. 287]. Зразумела: без падзвіжніцкай дзейнасці пісьменнікаў XVIII і XIX ст. (К. Марашэўскага, М. Цярцерскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча і інш.) беларуская літаратура такіх поспехаў не дасягнула б. Нагадаем пастанову польскага сейма 1696 г., якая забараняла ўжыванне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскай і культурнай дзейнасці краіны, і ўказ расійскага імператара Мікалая I ад 18 ліпеня 1840 г., паводле якога забаронена выкарыстанне нават самой назвы Беларусь. Узнікненне новай беларускай літаратуры (XIX ст.) было звязана з пытаннем адносін да мовы як мовы народных нізоў. Зварот В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Чачота да беларускай мовы быў актам грамадзянскай мужнасці.

Невыпадкова напалоханыя шквалам народнага гневу царскія ўлады пасля рэвалюцыі 1905-1907 гг. адмяняюць указ 1840 г. У літаратуры гэтага перыяду дамінавала нацыянальна-адраджэнцкая праблематыка, творы дапамагалі самаідэнтыфікацыі беларуса. У гэты час у літаратуру прыходзяць Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Ш. Ядвігін, З. Бядуля, А. Гарун, К. Каганец, М. Гарэцкі і інш. – пісьменнікі з розным светапо-

глядам, але ўсіх іх яднала імкненне аддаць сілы, каб родная Беларусь заняла «свой пачэсны пасад між народамі» (верш Я. Купалы «Маладая Беларусь»).

Працэс вобразнага ўспрымання тагачаснай рэчаіснасці быў даволі няпростым і пасля таго, калі Беларусь атрымала дзяржаўнасць і ўлады змаглі ўдзяліць літаратуры належную ўвагу. Літаратурнае пакаленне 20-х гадоў заявіла аб сабе з'яўленнем дзвюх новых плыняў: бурапеннай (тэрмін упершыню ўжыў А. Александровіч) і ажыўленскай (тэрмін прапанаваў А. Бабарэка). У выніку ўзнікла два гуртка маладых паэтаў – «Маладняк» (1923 г.) і «Узвышша» (1926 г.), якія пазней перараслі ва ўсебеларускія літаратурныя аб'яднанні паэтаў і пісьменнікаў. Паводле дадзеных, колькасць сяброў «Маладняка» дасягнула менш чым праз год 500 чалавек [5, с. 7]. Для беларускай літаратуры гэта астранамічныя лічбы. Яны сведчаць аб масавым далучэнні людзей да літаратуры. На жаль, некаторыя з маладнякоўцаў за заклікавай лозунгавасцю, рыторыкай, пафасам услаўлення рэвалюцыі не заўважылі важнасці вырашэння такой гуманістычнай мэты, як аднаўленне, сцвярджэнне чалавечай годнасці беларусаў. Вось чаму М. Чарот па-купалаўску сцвярджаў: «Пацерпім няшчасця бяз ліку мы, / Каб толькі назвацца людзьмі» [7, с. 67].

Узвышаўцы ўслед за М. Багдановічам сваю мэту бачылі ва ўключэнні беларускага ў сусветнае, агульналюдскае. Яны з самага пачатку адмовіліся ад рабскай пераймальнасці, правінцыйнай замкнёнасці, імкнуліся да творчых вышынь, марылі аб стварэнні літаратуры, як узвышша, «якое ўгледзяць вякі і народы» [1, с. 172]. Невыпадкова, калі пачаўся наступ камунізму на нацыянальным фронце, першымі былі арыштаваны, высланы самыя таленавітыя беларускія пісьменнікі, сябры «Узвышша», – Я. Пушча, А. Бабарэка, У. Дубоўка і інш. Страх, разгубленасць прымусілі пісьменнікаў, якім пашчасціла застацца па-за кратамі, знішчыць свае творы альбо славіць у іх савецкую рэчаіснасць («Ляўкоўскі цыкл» Я. Купалы). Жыццё беларускіх пісьменнікаў ператварылася ў суцэльную трагедыю. Да 1938 г. было рэпрэсіравана 128 членаў Саюза беларускіх пісьменнікаў. Засталося 14 з тых, хто пісаў па-беларуску [5, с. 3].

Вялікая Айчынная вайна стала самым трагічным выпрабаваннем грамадскай свядомасці беларускага народа. Да высокага гонару беларусаў, беларускіх пісьменнікаў засведчым, што ўсе сілы яны сфакусіравалі на абароне сваёй свабоды і свабоды Радзімы, што ў выніку і вызначае этнас як самастойны народ: «За няволю, за кайданы / Рэжце гітлерцаў паганых, / Каб не ўскрэслі век яны» (верш Я. Купалы «Беларускім партызанам»).

Палітычная структура дзяржавы не змянілася за час вайны. Пасля Дня Перамогі прагназуемай дэмакратызацыі не адбылося. Зноў пачаліся рэпрэсіі супраць нацыянальна свядомай інтэлігенцыі. У контррэвалюцыйнай дзейнасці быў абвінавачаны міністр асветы рэспублікі П. Саевіч. У другой палове 40-х – пачатку 50-х гадоў пісьменнікі не маглі належным чынам праявіць сваю грамадзянскую актыўнасць, выявіць творчую індывідуальнасць. Іх прымушалі кіравацца партыйнымі ўстаноўкамі. Напрыклад, тэатральны рэпертуар кантралявала партыйнае кіраўніцтва ў адпаведнасці з пастановай ЦК УКП(б) «Аб рэпертуары драматычных тэатраў і мерах па яго паляпшэнню» (1946 г.). Перавага аддавалася п'есам са стандартнымі сюжэтамі, схематычнымі персанажамі, пазбаўленым канфліктаў (згодна з існуючай тэорыяй бесканфліктнасці). Сатырычна-выкрывальны пафас камедыі К. Крапівы «Мілы чалавек» не зразумелі тагачасныя кіраўнікі. У выніку п'еса была названа «безыдэйнай», а аўтару ставілася ў віну скажонае ўяўленне пра савецкую рэчаіснасць [6, с. 209]. Барацьба за «чысціню» тэатральнага рэпертуару пазбаўляла магчымасці ўключаць у яго замежныя творы, якія быццам бы адмоўна ўплываюць на тагачаснага гледача. І толькі А. Макаёнку (п'еса «Выбачайце, калі ласка», 1953 г.) і К. Крапіве (артыкул «Канфлікт – аснова п'есы») удалося выцінуць тэорыю бесканфліктнасці з літаратурнай практыкі.

Пасля перамогі ваенна-камандны стыль яшчэ больш умацаваўся. Калі з вайны вярнуліся афіцэры і салдаты, яны занялі амаль усе кіруючыя пасады ва ўсіх сферах дзейнасці, у тым ліку, і ў культурнай. Невыпадкова ў беларускім фальклоры таго часу яскрава адлюстраваўся і замацаваўся вобраз кіраўніка сярэдняга звяна ў салдацкім фрэнчы.

З сярэдзіны 50-х гадоў пачалі яскрава выяўляцца новыя тэндэнцыі ў развіцці беларускай літаратуры. Насілі яны супярэчлівы характар. З аднаго боку былі пакладзены пачатак ліберальным рэформам, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай "хрушчоўскай адлігі". Прымаліся важныя рашэнні па вызваленні духоўных сфер жыцця ад скажэнняў эпохі сталінізму. Пачалася пасмяротная рэабілітацыя дзеячаў літаратуры, якія загінулі ў час масавых рэпрэсій, было наладжана выданне твораў раней забароненых творцаў (П. Галавача, М. Гарэцкага, С. Баранавых, М. Зарэцкага, У. Галубка і інш.). Праз часопіс "Маладняк", якому ў 1957 г. быў нададзены статус органа Саюза пісьменнікаў Беларусі, у літаратуру прыйшла вялікая плеяда паэтаў, дзяцінства якіх было абпалена вайной і якія адметна ўспрымалі навакольны свет. У пісьменніцкім асяроддзі з'явіліся новыя імёны (А. Вярцінскі, Я. Янішчыц, А. Разанаў, Н. Мацяш, Е. Лось, В. Зуёнак, Р. Барадулін, Г. Бураўкін і інш.), разгарнулася дыскусія пра месца пісьменніка ў жыцці грамадства.

У новых умовах пісьменнікі адчулі патрэбу ў неабходнасці паглыбіць мастацкую канцэпцыю чалавека ў сваіх творах, якая непасрэдна звязана з філасофска-мастацкім асэнсаваннем праблем быцця. У гэты час адметную ролю пачынае іграць філасофская лірыка, у якой у інтэлектуальна-эмацыянальным ключы асэнсоўваецца сутнасць такіх катэгорый, як жыццё і смерць, дабро і зло, прастора і час.

Паэты імкнуцца ўшчыльную наблізіцца да людскіх думак, пачуццяў. Працэс паглыблення гуманістычных асноў паэзіі абумовіў яе лірызацыю. Грамадскае і асабістае гарманічна паядноўваюцца: "Беларусь – мая маці і мова, паветра і хлеб! Гэта ўзважана сэрцам, на нервах расстайных дарог..." (верш А. Вялюгіна "Прызнанне ў любові").

Незадаволенасць напісаным па шаблонах ідэалагічных установак прыводзіць да з'яўлення вершаў ліра-сатырычнага зместу, у якіх арганічна спалучаюцца страсны маналог і выкрывальны змест (вершы "Прыстасаванцы", "Анкета" П. Панчанкі, "Паэты" К. Кірэенкі, "Дачнікі" М. Танка).

З другога боку, працэс дэмакратызацыі грамадскага жыцця інтэнсіўна суправаджаўся працэсам звужэння сферы ўжывання беларускай мовы. Выкладанне ў школах, вузах пераводзілася на рускую мову, бо, згодна афіцыйнай прапагандзе, у будучым камуністычным грамадстве адбудзецца зліццё нацый, а іх моў – у адзіную сусветную мову: "Сцвярджаюць гісторыкі і мовазнаўцы, / Што паступова сціраюцца грані нацый / І, нібыта як перажытак, / Аджыць павінна абавязкова / Мова маці маёй – беларуская мова..." (верш Р. Барадуліна "Мая мова").

Я. Брыль (аповесць "На Быстранцы"), І. Шамякін (раман "Крыніцы") паказалі, што працэс перабудовы грамадскага жыцця быў непаслядоўным. Любыя адхіленні ад афіцыйна вызначаных пастаноў падлягалі разбору ў партыйных органах і асуджэнню.

У. Караткевіч у вершы "Вадарод" адным з першых папярэдзіў, што атам – гэта магутная, але небяспечная сіла. Уладзімір Сямёнавіч імкнуўся прадухіліць экалагічную катастрофу. А між тым яго абвінавацілі ў чорнай меланхоліі, безнадзейнасці [4, с. 23-24]. Былі арганізаваны канферэнцыі абураных чытачоў, напісаны гнеўныя лісты ў Саюз пісьменнікаў. Ні сам У. Караткевіч, ні яго аднадумцы не маглі супрацьстаяць кампаніі, якая разгарнулася вакол імені пачынаючага творцы. У. Караткевіч болей не мог заставацца ў Оршы (родны горад) і пераехаў у Маскву. Экалагічная праблема, якую ён акрэсліў у 50-я гады ў беларускай паэзіі, была з цягам часу асэнсавана як агульназначная для сучаснасці і будучыні не толькі ў паэзіі (П. Панчанка "Не люблю я слова "пакарыцель"..."), але і прозе (В. Карамазаў (раман "Пушча"), В. Казько (раман "Не-

руш"), А. Жук (аповесць "Паляванне на Апошняга Жураўля"), драматургіі (А. Петрашкевіч "Соль") і інш.

Культ асобы быў асуджаны, але сістэма кіравання засталася ранейшай, што давала магчымасць такім як сакратар райкома Барадка, старшыня калгаса Махнач, завуч школы Арэшкін (героі рамана І. Шамякіна "Крыніцы") хутка прыстасавацца. Дарэчы, названы твор І. Шамякіна адзін з першых у нашай літаратуры з адметным адмоўным героем. Тым не менш, і ў творах гэтага пісьменніка ("Сэрца на далоні", "Атланты і карыятыды") выразна адчуваецца ідэалагічная тэндэнцыйнасць, арыентацыя на паспешлівае канструяванне так званага новага чалавека ў сацыялістычным грамадстве.

Новыя сацыяльна-палітычныя ўмовы спрыялі аднаўленню тэмы гістарычнага мінулага беларускага народа, якая фактычна была забаронена пасля 20-х гадоў. Важная месца ў яе развіцці належыць У. Караткевічу (раманы "Каласы пад сярпом тваім", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Чорны замак Альшанскі"). Творы беларускага аўтара прыйшліся не даспадобы прадстаўнікам афіцыйнай крытыкі [4, с. 125]. Яны не маглі пагадзіцца з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй мастака, які галоўным героем рамана "Каласы пад сярпом тваім" зрабіў не селяніна, накшталт Корчака, а князя, прадстаўніка старажытнага роду Алеся Загорскага. Пісьменнік праўдзіва паказаў, што інтарэсы і імкненні беларускага дваранства і нізоў супадалі. Традыцыі У. Караткевіча ў адлюстраванні нацыянальнай гісторыі знайшлі сваё развіццё ў прозе В. Іпатавай, У. Арлова, В. Чаропкі, Л. Дайнекі і г.д.

На працягу 60-80-х гадоў з'явіліся творы, у якіх асэнсоўваліся падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Важна, што аўтары – непасрэдныя ўдзельнікі падзей (Я. Брыль, А. Адамовіч, І. Навуменка, В. Быкаў і інш.) і пісьменнікі, якія перажылі яе ў дзяцінстве (В. Казько, І. Пташнікаў, І. Чыгрынаў і інш.). Адметнае месца займае раман Я. Брыля "Птушкі і гнёзды", у якім фашызм выкрыты знутры, з яго вытокаў, вачыма ваеннапалоннага. Пафіласофску заглыблена асэнсоўваецца ваенная тэма ў прозе В. Быкава. Сваіх герояў ён ставіць перад выбарам: выжыць альбо памерці, каб не страціць чалавечай годнасці. Творы беларускага пісьменніка нараджаліся пад вялікім ідэалагічным ціскам. В. Быкава абвінавачвалі, што ён з няправільных пазіцый піша пра вайну, прыніжае гераізм савецкіх воінаў. Па камандзе галоўных тады партыйных ідэолагаў М. Суслава, М. Зіммяніна і "спецыяліста па беларускай літаратуры" ў Аддзеле прапаганды ЦК КПСС У. Сеўрука былі арганізаваны калектыўныя пісьмы-пратэсты ветэранаў, камсамольцаў, незадаволеных быкаўскім адлюстраваннем вайны [3, с. 247]. Аповесць "Мёртвым не баліць" было загадана ніколі не друкаваць. І гэта нягледзячы на тое, што твор ужо выйшаў у перакладзе на іншыя мовы свету.

З 1985 г. ў грамадска-палітычным жыцці краіны пачынаюцца чарговыя змены. Час "перабудовы" падарыў людзям права на свабоду слова, свабоду мыслення як адзнаку поўнай рэалізацыі творчага патэнцыялу і выяўлення індывідуальных магчымасцей мастака ў яго памкненнях да спрадвечнай гармоніі, магчымасць адкрыта гаварыць праўду аб сваёй гісторыі і сучаснасці. Як у жыцці, так і ў літаратуры пасля атэістычнай д'ябальшчыны адраджаюцца імя і слова Бога (творчасць Р. Барадуліна, Г. Тварановіч-Сеўрук, І. Багдановіч і інш.). Менавіта ў гэты час па-новаму, дзякуючы творчасці П. Панчанкі, загучала тэма пакаяння. Ва ўсім былым СССР і БССР цяжка знайсці другога паэта, хто б здольны быў узяць віну на сябе за той стан, у якім апынулася Беларусь у канцы 80-х гадоў, хто б так шчыра каяўся, хоць сам асабіста ні ў чым не быў вінаваты: "То я ўзрасціў няўмек і гультаёў. / Застой. Крадзёж... / Я не збярог Купалу, / Мову не збярог. / Мне літасці няма і даравання. / Канчаецца апошняя з дарог, / Век ядзерны пачаў сваё рыканне" (П. Панчанка "Паэма сораму і гневу").

Адначасова час перабудовы прыўнёс у жыццё людзей дысгармонію, хаос, інфляцыю духоўнасці, эпідэмію жорсткасці, насілля, абыякавасці. І. Шамякін, В. Быкаў і інш.

ніколі, як і Я. Купала, Я. Колас не прытрымліваліся тэорыі дыстанцыі. Пісьменнікі не жадалі чакаць, покуль у краіне ўсё супакоіцца, стабілізуецца. Яны ішлі і ідуць па гарачых слядах, пішуць творы пра наша сучаснае жыццё, паказваюць яго такім, якое яно ёсць. Проза В. Быкава карысна чытачу ў практычным плане, бо, на вялікі жаль, беларусы – "бесхрыбетная нацыя" (апавяданне "Народныя мсціўцы") і, на наш сорам, вызначаюцца вялікай зацятасцю ў барацьбе са сваімі (прытча "Хвастаты").

Цяжка прагназаваць, у якім накірунку будзе развівацца надалей беларуская літаратура. Адно зразумела даволі пэўна: ёй – быць. Не маюць рацыі тыя крытыкі, якія лічаць, што нацыянальная літаратура ўступіла ў паласу стагнацыі. Хутчэй, гэта час адаптацыі пісьменнікаў да новых рэалій жыцця (двухмоўе, перапынілася дзейнасць па прапагандзе пісьменніцкай працы, раскол у Саюзе пісьменнікаў, у незваротнае мінулае адышла практыка дзяржаўнай падтрымкі і пратэкцыянізму ў адносінах да людзей творчых прафесій і г.д.).

Заслуга беларускіх пісьменнікаў у асэнсаванні зрухаў беларускай гісторыі бясспрэчна. Па-першае, яны абапіраюцца на даўно закладзены падмурак нацыянальнай літаратуры: на традыцыі М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага і г.д. Па-другое, беларускія пісьменнікі выразна ўсведамляюць запатрабаванні нашага сучасніка, не ігнаруюць той факт, што чытач, далучаны да каштоўнасцей сусветнай літаратуры, прагне твораў філасофскага напаўнення. Па гэтай прычыне наша літаратура не столькі адлюстроўвае рэчаіснасць, колькі, няхай і суб'ектыўна, пераасэнсоўвае, вытлумачвае жыццё сучасніка. Па-трэцяе, у літаратуры захавалася сістэма вучобы і падтрымкі пісьменнікаў-пачаткоўцаў. Па-чацвёртае, беларуская проза мае сваю нацыянальную спецыфіку. Народныя звычаі, этыка, мараль складаюць унутраную сутнасць героя. Па-пятае, становучасць характару вызначаецца не ідэальнасцю, а звычайнасцю, тым, што павінна сцвердзіцца ў жыцці як норма.

**Список цитированных источников**

1. Адамовіч, А. Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаванне "Узвышша" / А. Адамовіч // Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб. / Уклад. Я. Янушкевіч. – Мн.: Маст. літ., 1993. – С. 158–204.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. Т.2: Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 600 с., [4] л. іл.
3. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому. Кніга ўспамінаў / В. Быкаў. – Мн.: ГА БТ "Кніга", 2002. – 544 с.
4. Верабей, А.Л. Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча. – Мн.: Маст. літ., 1997. – 256 с.
5. Мельнікава, З.П. І ў новым свеце пройдзе ўсё...: дамапожнік па гісторыі беларускай літаратуры XX ст. / З.П. Мельнікава, К.М. Мароз. – Брэст: Выд-ва БрДУ ім. А. Пушкіна, 1999. – 120 с.
6. Семяновіч, А. А. Гісторыя беларускай савецкай драматургіі / А. А. Семяновіч. – Мн.: Выш. шк., 1990. – 294 с.
7. Чарот, М. Выбранае / М. Чарот. – Мн.: Маст. літ., 1982. – 185 с.

## УСТОЙЧИВОЕ РАЗВИТИЕ КАК МНОГОФАКТОРНЫЙ ПРОЦЕСС

Вайнилович Э.Г., Фалевич М.К.

*Белорусский национальный технический университет, г. Минск, Беларусь*

В настоящее время все большее количество философов, социологов, историков придерживаются точки зрения о том, что на современном этапе развития человечества формируется единая цивилизация на всей планете.

Укрепление этой идеи в науке и общественном сознании способствовало осознанию глобализации социальных и культурных процессов в современном мире. Этимология термина «глобализация» связывает его с латинским термином «глобус», т.е. Земля, Земной шар, и означает общепланетарный характер тех или иных процессов.